# МЕТОДЫКА ВЫКЛАДАННЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ ЯК НАВУКА

**Методыка выкладання беларускай мовы —** педагагічная навука, якая вызначае мэты, змест, прынцыпы, метады, прыёмы, формы навучання беларускай мове, заканамернасці засваення яе вучнямі.

Методыка выкладання беларускай мовы з'яўляецца не толькі навукай, але і вучэбнай дысцыплінай, якая ўваходзіць у вучэбны план установ вышэйшай адукацыі педагагічнага профілю і забяспечвае тэарэтычную і практычную падрыхтоўку студэнтаў-філолагаў да самастойнай прафесійнай дзейнасці.

Як і любая самастойная навука, методыка беларускай мовы мае свой прадмет вывучэння, свае задачы, змест, адпаведную сістэму паняццяў і тэрмінаў, уласныя метады даследавання.

Прадметам методыкі з'яўляецца працэс навучання беларускай мове, пры гэтым паняцце «навучанне» ўключае ў сябе: 1) дзейнасць настаўніка, накіраваную на перадачу ведаў школьнікам, арганізацыю іх вучэбна-пазнавальнай працы па засваенні таго ці іншага моўнага матэрыялу; 2) дзейнасць вучняў, у працэсе якой адбываецца авалоданне ведамі, уменнямі і навыкамі. Дзейнасць настаўніка і вучняў методыка разглядае як мэтанакіраванае ўзаемадзеянне, як супрацоўніцтва пры вядучай ролі настаўніка.

Методыка выкладання беларускай мовы вырашае наступныя задачы: 1) вызначае мэту і задачы навучання беларускай мове ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі, змест і аб'ём школьнага курса беларускай мовы, яго структуру, размеркаванне вучэбнага матэрыялу па гадах навучання, класах; 2) распрацоўвае найбольш эфэктыўныя метады, прыёмы, формы і сродкі навучання; 3) вызначае крытэрыі і метады ацэнкі ведаў, уменняў і навыкаў вучняў па беларускай мове.

Змест методыкі беларускай мовы як навукі і вучэбнай дысцыпліны складаюць наступныя раздзелы: 1) агульныя пытанні методыкі выкладання беларускай мовы; 2) методыка вывучэння раздзелаў курса беларускай мовы ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі; 3) методыка развіцця маўлення вучняў; 4) методыка пазакласнай працы па беларускай мове.

Методыка выкладання беларускай мовы як навука выкарыстоўвае разнастайныя паняцці і тэрміны: мэта і змест моўнай адукацыі, прынцыпы, метады, формы, сродкі навучання, урок і іншыя.

Для правядзення навукова-тэарэтычных і практыка-арыентаваных даследаванняў у галіне методыкі выкладання беларускай мовы выкарыстоўваюцца разнастайныя метады, напрыклад: 1) тэарэтычны аналіз літаратуры па методыцы выкладання беларускай мовы і сумежных навуках: педагогіцы, псіхалогіі, лінгвістыцы і інш.; 2) вывучэнне і абагульненне перадавога педагагічнага вопыту; 3) мэтанакіраванае назіранне за вучэбным працэсам; 4) індывідуальныя гутаркі з ўдзельнікамі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

навукова-педагагічнага даследавання; 5) анкетаванне, тэсціраванне, педагагічны эксперымент; 6) статыстычная апрацоўка атрыманых вынікаў.

Найбольш пашыраным метадам даследавання з’яўляецца эксперымент. З яго дапамогай правяраецца эфектыўнасць новых вучэбных праграм, падручнікаў, дапаможнікаў, пэўных метадаў і сістэм навучання і іншыя

Як галоўны метад даследавання, эксперымент бывае канстатацыйны (канстатацыйны зрэз), навучальны і кантрольны (кантрольны зрэз). Мэта канстатацыйнага эксперымента — вызначыць рэальны ўзровень ведаў, уменняў і навыкаў вучняў, ступень засваення імі пэўнай тэмы, раздзела і інш. Гэта адбываецца, як правіла, з дапамогай спецыяльна падабраных заданняў. Пры арганізацыі навучальнага эксперымента вызначаюцца мэта і задачы эксперыментальнага навучання, яго змест, метады і прыёмы вучэбна-пазнавальнай дзейнасці школьнікаў. Пасля навучальнага эксперымента праводзіцца кантрольны зрэз, аналіз вынікаў якога дазваляе выявіць эфектыўнасць распрацаванай даследчыкам эксперыментальнай методыкі.

*У.П. Саўко.*

*Саўко, У. П. Методыка выкладання беларускай мовы / У. П. Саўко // Энцыклапедыя для школьнікаў і студэнтаў. У 12 т. Т. 7 Беларуская мова. – Мінск: Беларуская энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 2017.* – Беларуская мова ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ